iSANS | The International Strategic Action Network for Security

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Агляд асноўных падзей і тэндэнцый за жнівень 2024 года**

**Гэтае даследаванне ўяўляе сабой агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам жніўня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці.**

У жніўні былі выяўлены такія тэндэнцыі:

- **Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры афіцыйных беларускіх уладаў па-ранейшаму застаецца амаль цалкам манапалізаваным Расіяй.**

У жніўні 2024 года ў Telegram-канале Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь было змешчана 44 арыгінальныя навіны, якія тычацца міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Гэта дакладна столькі ж, колькі было ў папярэднім месяцы. Звяртае на сябе ўвагу тое, што большасць гэтых навін (31) з'явілася цягам апошняй дэкады месяца.

| **Краіна** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Расія | 25 |
| Узбекістан | 7 |
| Кітай | 6 |
| Пакістан | 2 |
| Сербія | 2 |
| Індыя | 1 |
| Некалькі краін | 1 |

Галоўным для Беларусі партнёрам у культурнай сферы па-ранейшаму застаецца Расійская Федэрацыя. У жніўні ў Беларусі прайшлі шматлікія супольныя беларуска-расійскія мерапрыемствы, сярод якіх: фестываль Саюзнай дзяржавы «Творчасць юных» у Маскве[1,2], Дні Віцебскай вобласці ў Пскове[3] і многія іншыя.

Таксама можна гаварыць пра актыўныя намаганні беларускіх уладаў наладзіць стасункі (у тым ліку культурніцкія) з усходнімі краінамі: былі падпісаны мемарандумы аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным музеем гісторыі Узбекістана[4], паміж Вялікім тэатрам Беларусі і Дзяржаўным акадэмічным тэатрам Узбекістана ім. А. Навоі[5,6]; Беларусь і Кітай

[1] https://t.me/minkultrb/40846
[2] https://www.belta.by/society/view/festival-sojuznogo-gosudarstva-tvorchestvo-junyh-posvjatjat-80-letiju-osvobozhdenija-belarusi-654219-2024/
[3] https://t.me/minkultrb/41315
[4] https://t.me/minkultrb/41172
[5] https://t.me/minkultrb/41181
[6] https://t.me/minkultrb/41203

падпісалі дамову аб стварэнні мастацкага фільма «На вякі вечныя»[7,8,9,10,11]; у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыўся Кітайскі цэнтр кнігі[12,13] і г. д.

Што тычыцца супрацоўніцтва з заходнімі краінамі, то цягам месяца такіх выпадкаў ізноў не было зафіксавана.

- **Расія, (пра)расійскія арганізацыі і актывісты не спыняюць сваю актыўнасць, праводзячы ў Беларусі экспансію расійскай культуры і рускай мовы і ствараючы падмурак для далейшай інтэграцыі праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг і г. д.**

У перыяд з 1 па 31 жніўня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

- паказ беларускім школьнікам расійскіх фільмаў і мультфільмаў[14,15,16,17,18,19,20,21,22].

- курсы павышэння кваліфікацыі для выкладчыкаў рускай мовы[23].

- «За русский!» — праект па прасоўванні рускай мовы і літаратуры за мяжой, у выніку якога плануецца накіраваць ў Рускія Дамы за мяжу спецыялістаў, якія прымуць удзел у рэалізацыі праектаў і падрыхтоўцы мерапрыемстваў па распаўсюджванні рускай мовы па ўсім свеце[24] і г. д.

- **Назіраецца павышаная ўвага дзяржавы да нацыянальнай гістарыяграфіі.**

Беларускія ўлады няспынна перапісваюць гісторыю Беларусі згодна з найноўшымі ідэалагічнымі наратывамі і ва ўгоду беларуска-расійскай інтэграцыі, бяруць пад татальны кантроль любы распаўсюд гістарычных ведаў:

- у школьнай праграме па гісторыі з’явіліся пытанні «Супраціўленне беларускага народа германскай акупацыі» і «Супраціўленне беларускага народа польскай акупацыі»[25].

---

[7] https://reformby.org/belarusfilm-nadeetsja-povysit-turisticheskuju-privlekatelnost-strany-sovmestnym-filmom-s-kitaem
[8] https://www.sb.by/articles/belarusfilm-priglashaet-akterov-na-kasting-dlya-semki-v-pervom-sovmestnom-belorussko-kitayskom-filme.html
[9] https://nashaniva.com/349868
[10] https://t.me/minkultrb/41003
[11] https://t.me/minkultrb/41037
[12] https://t.me/minkultrb/41174
[13] https://t.me/minkultrb/41217
[14] https://t.me/russiangomel/4554
[15] https://t.me/russiangomel/4564
[16] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14516
[17] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14520
[18] https://t.me/russiangomel/4592
[19] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14597
[20] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14603
[21] https://t.me/russiangomel/4678
[22] https://t.me/russkiydomvgrodno/1686
[23] https://t.me/russkiydomvgrodno/1592
[24] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14596
[25] https://t.me/historiographe/14725

- у школах уводзяць штомесячныя інфармгадзіны аб генацыдзе беларускага народа[26]. А адзін з мінскіх будынкаў даваеннай пабудовы могуць ператварыць у музей генацыду беларускага народа[27].

- у вучэбнай праграме «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» для БНР не знайшлося месца[28].

- напярэдадні навучальнага года наданне Ліцэю БДУ імя Фелікса Дзяржынскага афіцыйна замацавалі літарамі на фасадзе будынка[29].

- суд у Мінску прызнаў «экстрэмісцкімі» кнігі гісторыка Ігара Мельнікава, які больш за паўгода знаходзіцца ў зняволенні[30] і іншыя навіны.

- **У ідэалагічнай сферы па-ранейшаму вялікая ўвага надаецца тэме Вялікай айчыннай вайны. Цягам месяца былі зафіксаваны шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай старонцы гісторыі ў сувязі з 80-годдзем з Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:**

- на Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» была арганізавана работа ваенна-палявога кінатэатра пад адкрытым небам[31].

- у Магілёве поўным ходам ідзе будаўніцтва Музея Славы Магілёўскай вобласці[32].

- у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адбыўся пленэр, прысвечаны 80-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[33,34].

- каравай-фэст «Бацькава булка», які прайшоў у Свіслачы пад лозунгам «Мір. Гаспадар. Дабрабыт», быў прысвечаны 30-годдзю Прэзідэнцтва, а таксама 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[35].

- на Дні горада Капыля працавала мабільная экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Наш абавязак — памятаць»[36]. Гэтая ж экспазіцыя працавала і ў Івацэвічах у рамках Дня беларускага пісьменства[37,38], гасцям якога таксама паказалі ваенна-гістарычную рэканструкцыю вызвалення Івацэвіцкага раёна[39].

---

26 https://reformby.org/v-shkolah-vvodjat-ezhemesjachnye-informchasy-o-genocide-belarusskogo-naroda
27 https://news.zerkalo.io/life/76894.html?c
28 https://t.me/euroradio/56536
29 https://t.me/euroradio/56335
30 https://news.zerkalo.io/life/77100.html?c
31 https://t.me/minkultrb/40483
32 https://t.me/minkultrb/40710
33 https://t.me/minkultrb/40847
34 http://ncsm.by/calendar/vystava-zhyvyya-pakul-pamyataem
35 https://t.me/minkultrb/40876
36 https://t.me/minkultrb/41104
37 https://t.me/minkultrb/41357
38 https://t.me/minkultrb/41146
39 https://t.me/kultinfa/8343

- на Кургане Славы прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[40]. Таксама стала вядома, што каля «Кургана Славы» прапануюць пабудаваць музей гісторыі Узброеных Сіл[41], а ў Мінску пачне працаваць музей авіяцыйнай тэхнікі[42].

- распачалі працу шматлікія выставы, прысвечаныя ВАВ: Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр — выстава твораў беларускіх мастакоў «Фарбы Вялікай Перамогі»[43]; Музей гісторыі горада Брэста — выстава «У нас ёсць адна толькі мэта — Перамога»[44]; Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — часовая экспазіцыя «Мы набліжалі Перамогу»[45] і г. д.

- **Па-ранейшаму назіраецца папулярызацыя рускай мовы і стварэнне адзінай (руска)моўнай прасторы.**

За жнівень 2024 года афіцыйны тэлеграм-канал[46] Міністэрства культуры апублікаваў 261 навіну. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных на тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 201 |
| Беларуская | 42 |
| Абедзве | 18 |

- зафіксаваны выпадак варожага стаўлення да беларускай мовы з боку адміністрацыі віцебскай калоніі №3[47].

- у Валожыне да Дажынак пачалі ўсталёўваць указальнікі для турыстаў. Адметна тое, што ўсе яны на рускай мове. Месца для беларускай мовы не знайшлося[48].

- у Беларусі прызналі экстрэмісцкімі суполкі аматараў беларускамоўнай Вікіпедыі ва «Укантакце» і ў Telegram[49].

- **Беларуская нацыянальная культура ўсё больш прывязваецца да расійскай і працягвае існаваць ва ўмовах рэпрэсій і забарон.**

[40] https://t.me/minkultrb/41152
[41] https://t.me/minkultrb/40610
[42] https://reformby.org/muzej-aviatehniki-otkroetsja-v-minske-v-avguste
[43] https://t.me/kultinfa/7961
[44] https://t.me/kultinfa/8006
[45] https://t.me/kultinfa/8012
[46] https://t.me/MinobrofBelarus

[47] https://spring96.org/be/news/116138
[48] https://t.me/spadczyna/11047
[49] https://t.me/viasna96/27291

У жніўні прызналі экстрэмісцкімі Instagram-старонку мастака Уладзіміра Цэслера[50].

***Беларуская літаратура:***

- дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін залічыў беларускага першадрукара Францыска Скарыну стваральнікам «рускай цывілізацыі»[51] і чарговы раз паспрабаваў выштурхнуць з нацыянальнай літаратуры Ларысу Геніюш[52].

- знакаміты верш Янкі Купалы «Хто ты гэткі» прызналі экстрэмісцкім[53].

***Нацыянальны тэатр:***

- сталі рэгулярнымі звальненні ў беларускіх тэатрах[54,55].

- пераважная большасць спектакляў у праграме XXVIII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая Вежа» будзе па творах рускай класікі[56].

- гастрольны сезон у Вялікім тэатры Беларусі адкрые Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатр імя Наталлі Сац[57].

- да 180-годдзя з дня нараджэння рускага кампазітара М. Рымскага-Корсакава ў Вялікім тэатры Беларусі прайшоў паказ оперы «Царская нявеста»[58].

- стала вядома, што ў верасні на сцэне Вялікага тэатра Беларусі загучаць «меладычныя і кранальныя, шчырыя і лірычныя» рускія рамансы[59].

- расійскі рэжысёр паставіць у Купалаўскім тэатры спектакль «Дзядзечкін сон» па творы рускага пісьменніка Дастаеўскага[60].

- у той самы час стала вядома, што акцёр-купалавец Дзмітрый Есяневіч сутыкнуўся з рэпрэсіямі ў Беларусі[61].

***Нацыянальная кінаіндустрыя:***

- кінастудыя «Беларусьфільм» падпісала мемарандум аб вытворчасці фільма «Бацька Мінай» з генеральным дырэктарам студыі «ВаенФільм», народным артыстам РФ Ігарам Угольнікавым[62].

- у Мінску прэзентавалі стужку «Культурны код» аб дзяржаўных сімвалах[63,64].

---

[50] https://t.me/viasna96/27430
[51] https://t.me/Gigin_Vadim/1448
[52] https://t.me/Gigin_Vadim/1477
[53] https://nashaniva.com/350337
[54] https://news.zerkalo.io/cellar/74488.html?c
[55] https://news.zerkalo.io/cellar/75402.html?tg=7
[56] https://reformby.org/u-pragrame-brjesckaga-tjeatralnaga-festyvalju-belaja-vezha-nechakana-z-javi-sja-tjeatr-z-polshy-ale-spektakl-admeneny
[57] https://t.me/bolshoibelarus/25930
[58] https://t.me/bolshoibelarus/25987
[59] https://web.telegram.org/a/#-1001342250010
[60] https://reformby.org/spektakl-rasijskaga-rjezhysjora-i-netryvijalnyja-padyhody-da-pastanovak-u-akadjemichnym-tjeatry-imja-janki-kupaly-pacha-sja-105-y-tjeatralny-sezon
[61] https://nashaniva.com/349727
[62] https://www.belta.by/society/view/ugolnikov-o-filme-batka-minaj-my-nachinaem-podgotovku-k-sjemkam-kartiny-654017-2024/
[63] https://reformby.org/po-zakazu-ministerstva-kultury-v-minske-prezentovali-lentu-kulturnyj-kod-o-gosudarstvennyh-simvolah
[64] https://t.me/minkultrb/41005

***Нацыянальны музей:***

- у духоўна-асветніцкім цэнтры «Каўчэг» Свята-Елісавецінскага манастыра ў Мінску адкрылася выстава графічных работ Юліі Таўстоўсавай «Люди, опалённые войной» і экспазіцыя карцін Святланы Жыгімонт «Когда пойду долиной смертной тени». Творы расійскай і беларускай мастачак прысвечаны Данбасу[65,66].

- музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» (г. Брэст) — выстава «Рускі імпрэсіянізм»[67].

- мастацкі музей (Віцебск) — выстава «Рэпін і вучні»[68].

- гістарычны музей Крычава — выстава «Жаночая палова» расійска-беларускага мастацкага праекта «Абярэжны круг»[69].

**Гэтыя тэндэнцыі могуць мець для Беларусі сур'ёзныя наступствы, паколькі яны накіраваны на страту яе самабытнасці, на стварэнне ўмоў для далейшай інтэграцыі з Расіяй. А пры адначаснай экспансіі расійскай культуры — і на знікненне ў ёй. Беларусь паступова страчвае сваю нацыянальную індывідуальнасць. У інтэрв'ю тэлеканалу «Расія» Лукашэнка ўжо сказаў, што беларусы нічым не адрозніваюцца ад рускіх[70].**

[65] https://t.me/RusEmbassyMinsk/5184
[66] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/32440
[67] https://t.me/kultinfa/7956
[68] https://t.me/kultinfa/8016
[69] https://t.me/kultinfa/8165
[70] https://nashaniva.com/349306

**У Магілёве поўным ходам ідзе будаўніцтва Музея Славы Магілёўскай вобласці, Нацыянальную бібліятэку наведала дэлегацыя Антытэрарыстычнага цэнтра СНД, у Мінску прайшоў памятны мітынг, прысвечаны 110-годдзю пачатку Першай сусветнай вайны, каля «Кургана Славы» прапануюць пабудаваць музей гісторыі Узброеных Сіл, у сталіцы пачне працаваць музей авіяцыйнай тэхнікі, у беларускіх тэатрах адбыліся чарговыя звальненні, пераважная большасць спектакляў у праграме тэатральнага фестывалю «Белая Вежа» будзе па творах рускай класікі, гастрольны сезон у Вялікім тэатры Беларусі адкрые тэатр з Масквы, у Беларусі ліквідуюць клуб гістарычнай рэканструкцыі «Рыцары Утрэмера», «Беларусьфільм» спадзяецца павысіць турыстычную прывабнасць краіны сумесным фільмам з Кітаем, У Свята-Елісавецінскім манастыры ў Мінску адкрылася выстава расійскай і беларускай мастачак, прысвечаная Данбасу, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін залічыў беларускага першадрукара Францыска Скарыну стваральнікам «рускай цывілізацыі» і чарговы раз паспрабаваў выштурхнуць з нацыянальнай літаратуры Ларысу Геніюш — навіны культуры за перыяд 1-10 жніўня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд **1-10 жніўня 2024 года** на афіцыйным сайце[71] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 2 навіны, якія былі прысвечаны: рабочай паездцы ў Бабруйск міністра культуры Анатоля Маркевіча[72], ММКФ «Лістапад»[73]. Афіцыйны тэлеграм-канал[74] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 85 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных на тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| Мова паведамленняў | колькасць навін |
|---|---|

[71] https://www.kultura.by/

[72] https://www.kultura.by/news/v-ramkakh-rabochey-poezdki-v-bobruysk-ministru-kultury-anatoliyu-markevichu-byli-ozvucheny-rezultaty/

[73] https://www.kultura.by/news/pervyy-rolik-mmkf-listapad-/

[74] https://t.me/MinobrofBelarus

| | |
|---|---|
| Руская | 71 |
| Беларуская | 8 |
| Абедзве | 6 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 9 навін;

• культурная тэматыка — 60 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 7 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 3 навіны.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***

- Здзейсніў рабочую паездку ў Бабруйск. У рамках паездкі адбылася сустрэча са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Анатолем Ісачэнкам, азнаямленне з аб’ектамі, уключанымі ў склад гісторыка-культурнай каштоўнасці ІІ катэгорыі «Крэпасць», наведванне храма Аляксандра Неўскага. Падчас сустрэчы разглядалася выкананне даручэнняў Аляксандра Лукашэнкі па навядзенні парадку на аб’ектах Бабруйскай крэпасці, якія той даў падчас працоўнай паездкі ў Бабруйск у 2022 годзе[75].

***Першы намеснік Міністра культуры Валерый Грамада:***

- Правёў рабочую сустрэчу на археалагічным аб’екце на рацэ Менцы ў Мінскім раёне. Сумесна з прадстаўнікамі інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага музея агледзеў тэрыторыю, на якой праводзяцца археалагічныя даследаванні, абмеркаваў перспектывы развіцця гэтага аб’екта і правядзенне выставы артэфактаў, знойдзеных на месцы раскопак[76].

***Начальніца аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Марына Юркевіч:***

[75] https://t.me/minkultrb/40490
[76] https://t.me/minkultrb/40662

- Наведала ўстановы культуры і адукацыі ў сферы культуры Маладзечанскага раёна, азнаёмілася з ходам падрыхтоўкі да новага навучальнага года ў Аляхновіцкай, Радашковіцкай, Чысцінскай і Красненскай школах мастацтваў[77].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- КУП «Гомелькінавідэапракат» прыняў удзел у VIII Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Кліч Палесся». У рамках фестывалю была арганізавана работа ваенна-палявога кінатэатра пад адкрытым небам інтэрактыўнай пляцоўкі «Партызанскі край». Гасцям кінатэатра была прапанавана праграма мастацкіх, хранікальна-дакументальных і анімацыйных фільмаў розных гадоў ваеннай тэматыкі вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм» і Дзяржаўнай установы «Гомельскі абласны цэнтр інклюзіўнай культуры»[78].

- У Музеі гісторыі беларускага кіно ў рамках часовай экспазіцыі «Па той бок кінахронікі» адбылася лекцыя на тэму «Адлюстраванне Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім кінематографе розных гадоў»[79].

- Да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне народная аматарская кінавідэастудыя «Ракурс» Гомельскага абласнога цэнтра інклюзіўнай культуры рыхтуе новы сацыяльна-значны кінапраект «Дарагая маці...», накіраваны на *«захаванне гістарычнай памяці, міру, праўды і патрыятычнае выхаванне»*[80].

- У Магілёве поўным ходам ідзе будаўніцтва Музея Славы Магілёўскай вобласці. Работы па ўзвядзенні музея пачаліся ў ліпені мінулага года. Па задуме архітэктараў сучасны музейна-культурны комплекс перадасць *«вялікі подзвіг народа, гераізм і мужнасць абаронцаў Прыдняпроўскага краю, падкрэсліць іх значнасць у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і краіны ў цэлым»*[81].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 3 навіны, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

***Узбекістан:***

- У Ташкенцкім доме фатаграфіі адкрылася фотавыстава «Позірк сяброўства». У экспазіцыю ўвайшлі творы, якія адлюстроўваюць лад жыцця, культуру, традыцыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія жывуць ва Узбекістане, а таксама фатаграфіі, прысвечаныя дзейнасці

[77] https://t.me/minkultrb/40708
[78] https://t.me/minkultrb/40483
[79] https://t.me/minkultrb/40488
[80] https://t.me/minkultrb/40655
[81] https://t.me/minkultrb/40710

нацыянальных культурных цэнтраў і таварыстваў сяброўства. На фатаграфіях у тым ліку была паказана культурная і грамадская дзейнасць Беларускага культурнага цэнтра «Світанак» Ташкента і дзеючага пры ім ансамбля «Кацюша». Часовы паверaны ў справах Беларусі ва Узбекістане Аляксандр Апімах адзначыў важны ўклад БКЦ «Світанак» у захаванне і прасоўванне беларускай культуры і традыцый ва Узбекістане, умацаванне беларуска-ўзбекскай дружбы і ўзаемаразумення праз пашырэнне кантактаў у духу народнай дыпламатыі[82,83].

***Расія:***

- Беларускую Нацыянальную бібліятэку наведала дэлегацыя Антытэрарыстычнага цэнтра СНД. Экскурсію для гасцей правёў генеральны дырэктар бібліятэкі Вадзім Гігін. У рамках сустрэчы былі абмеркаваны магчымасці пашырэння і ўмацавання міжнароднага супрацоўніцтва, далейшага развіцця ўзаемадзеяння паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй[84].

***Некалькі краін адразу:***

- Расказваючы пра падрыхтоўку да XI Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель), галоўны рэжысёр Пётр Свярдлоў паведаміў: *«Российские коллективы представят танцевальную палитру, начиная от Урала и заканчивая Брянском. Зрителей ждёт встреча с грузинскими и азербайджанскими ансамблями, а также экзотическими танцорами из Шри-Ланки. Ожидается приезд и других хореографических коллективов из восточных стран, а также ближнего и дальнего зарубежья»*[85].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі («Рускі Дом у Гомелі», «Рускі Дом у Мінску», «Рускі Дом у Брэсце», «Рускі Дом у Гродне»), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 1 па 10 жніўня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў у Беларусі:

---

[82] https://t.me/minkultrb/40594
[83] https://www.belta.by/society/view/na-fotovystavke-v-tashkente-predstavlena-dejatelnost-belorusskoj-diaspory-652398-2024/
[84] https://t.me/minkultrb/40686
[85] https://t.me/minkultrb/40635

- **Памятны мітынг, прысвечаны 110-годдзю пачатку Першай сусветнай вайны** *(Мінск, Брацкія ваенныя могілкі).* Па запрашэнні грамадскіх аб'яднанняў «Потомки казаков России» і «Союз казаков» у мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і прадстаўніцтва «Россупрацоўніцтва» ў Рэспубліцы Беларусь[86].

- **Круглы стол «Гістарычная памяць: Першая сусветная вайна скрозь прызму часу»** *(Смаргонь).* У мерапрыемстве прынялі ўдзел дарадца Пасольства Расіі ў Беларусі Сяргей Афонін, кіраўнік «Рускага Дома ў Гродне» Алена Літвішчанка, старшыня Гродзенскага аддзялення «Рускага таварыства» Аляксандр Бірукоў[87].

- **Прэзентацыя серыі выданняў «Кнігі памяці»** *(Мінск, мультымедыйны прэс-цэнтр Sputnik Беларусь).* Адзін з тамоў беларускай «Кнігі памяці», які расказвае пра подзвіг жыхароў Мінска і Мінскай вобласці, стварaўся пры падтрымцы фонду «Рускі свет». Таксама дапамогу аказала «Россупрацоўніцтва», асабіста прыняў удзел і Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс Грызлоў. Выканаўчы дырэктар міжнароднага праекта «Кніга памяці» Юрыюс Тракшаліс расказаў, што яшчэ ў 2019 годзе Уладзімір Пуцін падпісаў даручэнне аб стварэнні такіх выданняў. У іх гаворыцца аб пахаваннях савецкіх воінаў, партызан, ахвяр фашызму і іншых памятных месцах[88,89].

- **Паказ беларускім школьнікам расійскіх фільмаў і мультфільмаў** *(Гомель).* «Рускі Дом у Гомелі» арганізаваў прагляд расійскіх мультфільмаў для малодшых класаў сярэдняй школы №44[90] і расійскіх фільмаў *(«о дружбе, любви и юности»)* — для старэйшых класаў той жа школы горада Гомеля[91].

- **Пешы паход дарогамі воінскай славы** *(Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці).* Актывісты руху «Пешшу па Беларусі» прайшлі дарогамі воінскай славы па Брэсцкай вобласці. Паход па Івацэвіцкім раёне пры падтрымцы «Рускага Дома ў Брэсце» быў прысвечаны 80-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У праекце ўдзельнічалі моладзь з Мінска, Брэста, Маларыты, Пружан і Драгічына, мясцовыя краязнаўцы, блогеры і гісторыкі. Група з 20 чалавек пабывала ў месцах баёў, дзе часці Заходняй ваеннай асобай акругі прарываліся з акружэння ў 1941 годзе, наведала помнік юнаму партызану Мікалаю Гойшыку, а таксама месцы генацыду беларускага народа[92].

- **Відэаканферэнцыя з адміністрацыяй МА «Зеленаградская гарадская акруга» (Калінінградская вобласць) у рамках пачатку рэалізацыі праекта: «Ліда — горад котак»** *(Гродна, офіс «Рускага Дома»).*

[86] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14370
[87] https://t.me/russkiydomvgrodno/1472
[88] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14456
[89] https://sputnik.by/20240808/knigu-o-vklade-belorusov-v-pobedu-prezentovali-v-minske-1088613510.html
[90] https://t.me/russiangomel/4554
[91] https://t.me/russiangomel/4564
[92] https://t.me/rcnkbrest/23376

Зеленаградск знакаміты адмысловым статутам «Горада котак». Гэта адзінае месца ў Расіі, дзе ўведзена пасада каташэфа, у гонар катоў тут адкрываюць музеі і праводзяць фестывалі. Такі ж праект зараз хочуць рэалізаваць і на тэрыторыі горада Ліда Гродзенскай вобласці. *«Малые архитектурные формы, муралы — это то, с чего мы начнем. Домики и организация инфраструктуры в городе для кошек. Мне кажется, что для это не нужно очень много денег, нужно просто приложить немного усилий. Самое главное — это понимание, что это можно сделать»,* — паведаміў дэпутат Лідскага раённага Савета дэпутатаў Павел Жульпа[93].

**Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 1-10 жніўня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці**

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**Каля «Кургана Славы» прапануюць пабудаваць музей гісторыі Узброеных Сіл, а ў Мінску пачне працаваць музей авіяцыйнай тэхнікі.**

Аляксандру Лукашэнку далажылі аб ходзе рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». Акрамя работ па добраўпарадкаванні, ёсць ідэя пашырыць экспазіцыю тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ адна прапанова — стварыць каля Кургана музей гісторыі Узброеных Сіл[94]. А ў жніўні ў Мінску пачне працаваць музей авіяцыйнай тэхнікі пад адкрытым небам. Ён адкрыецца ў аэраклубе ДТСААФ імя С. І. Грыцаўца. Раней музей працаваў на аэрадроме ў Баравой. Аднак пазней яго перанеслі на аэрадром Ліпкі. У музеі будзе прадстаўлена больш за 40 адзінак авіятэхнікі, у тым ліку планёры, аэробусы, знішчальнікі, бамбавікі і іншыя пасажырскія і ваенныя самалёты. Як паведамілі ў ДТСААФ, экспазіцыя павялічылася ў параўнанні з той, якая была ў Баравой. Узброеныя сілы перадалі тэхніку, а таксама былі рэканструяваны машыны, якія раней не экспанаваліся[95].

[93] https://t.me/russkiydomvgrodno/1524
[94] https://t.me/minkultrb/40610
[95] https://reformby.org/muzej-aviatehniki-otkroetsja-v-minske-v-avguste

***

**Звальненні ў беларускіх тэатрах сталі рэгулярнымі. Свае пасады згубілі дырэктарка РТБД і дырэктар Гомельскага тэатра лялек.**

Дырэктарка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Святлана Карукіна была звольненая з пасады яшчэ ў ліпені гэтага года. Пацверджаннем гэтага сталі змены на сайце тэатра. Прозвішча і партрэт Карукінай адтуль зніклі. Апошнім часам РТБД заставаўся адным з самых папулярных беларускіх калектываў[96]. З Гомельскага тэатра лялек звольнілі дырэктара Дзмітрыя Гарэліка. На сайце тэатра пасада дырэктара зараз вакантная. Гарэлік не згадваецца ў тэксце пра гісторыю тэатра, хаця ён кіраваў ім з 1992 года. Прычынай звальнення з вялікай доляй верагоднасці сталі рэпрэсіі. У студзені гэтага года Гарэліка судзілі па ч. 2 арт. 19.11 КаАП (Распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў). Праваабаронцы тады так і не даведаліся, у чым абвінавачвалі мужчыну і якое рашэнне прыняў суд[97]. Нагадаем, што толькі ў 2024 годзе з беларускіх тэатраў былі звольненыя: у лютым — дырэктарка Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка» Святлана Чаеўская; у сакавіку — дырэктар сталічнага Музычнага тэатра Сяргей Пукіта; у пачатку красавіка — мастацкі кіраўнік віцебскага тэатра «Лялька» Віктар Клімчук; у красавіку — дырэктар Беларускага тэатра лялек Дзмітрый Сямёнаў (пазней стала вядома, што ён стаў намеснікам кіраўніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама); у маі — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага тэатра оперы і балета Валянцін Елізар'еў.

***

**Пераважная большасць спектакляў у праграме XXVIII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая Вежа» будзе па творах рускай класікі.**

З 10 па 15 верасня ў Брэсце пройдзе XXVIII Міжнароды тэатральны фестываль «Белая Вежа». Апошнія гады вядомы форум складае праграму з пастановак пераважна тэатраў СНД. Сёлета нечакана ў яго праграме быў заяўлены спектакль польскага Сучаснага тэатра танца Materia з Лодзі. Але спектакль «Літас» польскай каманды ўжо адменены «па тэхнічных прычынах». Такім чынам, у афішы фестывалю прадстаўлены 22 спектаклі ад 22 тэатральных калектываў. Можна заўважыць, што пераважная большасць спектакляў у праграме «Белай Вежы» — па творах рускай класікі: Аляксандра Пушкіна, Міхаіла Лермантава, Фёдара Дастаеўскага, Аляксандра Астроўскага, Івана Тургенева, Максіма Горкага, Антона Чэхава і іншых аўтараў, невялікі адсотак спектакляў паводле Уільяма Шэкспіра. Што тычыцца беларускіх тэатраў, то Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы адкрые фестываль пастаноўкай «Бацькі і дзеці» паводле твора Івана Тургенева, Горкаўскі рускі тэатр выступіць з «Маскарадам» паводле п'есы Міхаіла Лермантава, ТЮГ пакажа «Джоні — правадыр індзейцаў» паводле

[96] https://news.zerkalo.io/cellar/74488.html?c
[97] https://news.zerkalo.io/cellar/75402.html?tg=7

апавядання О. Генры, Брэсцкі тэатр лялек — «Вішнёвы сад» Антона Чэхава, Купалаўскі тэатр заяўлены з «Казкай аб мёртвай царэўне» паводле казкі, уласна, Аляксандра Пушкіна (але тэатр ужо замяніў пастаноўку на «Пісаравы імяніны» паводле п’есы Уладзіслава Галубкі). Адзіны беларускі тэатр, які на фестывальнай сцэне першапачаткова быў са спектаклем на аснове беларускага матэрыялу — гэта Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Вядомы калектыў прадставіць на фэсце пастаноўку «Карней» паводле твораў Уладзіміра Караткевіча ў рэжысуры Алены Зміцер. Сёлета тэатральны форум ладзіцца пры фінансавай падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і гэта шмат тлумачыць у яго культурнай палітыцы[98].

***

**Стала вядома, што гастрольны сезон у Вялікім тэатры Беларусі адкрые Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатр імя Наталлі Сац.**

25-26 кастрычніка госці прадставяць оперу Ж. Бізэ «Кармэн» у пастаноўцы мастацкага кіраўніка МДАМТ ім. Н. І. Сац Георгія Ісаакяна. 27 кастрычніка на беларускай сцэне опера сучаснага расійскага кампазітара Яфрэма Падгайца «Уладар мух»[99]. А новы 92-ы тэатральны сезон у тэатры адкрые 8 верасня опера Рымскага-Корсакава «Царская нявеста»[100].

***

**У Беларусі ліквідуюць клуб гістарычнай рэканструкцыі «Рыцары Утрэмера».**

Пазоў Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі міжнароднага грамадскага аб’яднання «Рыцары Утрэмера» будзе разглядацца 14 жніўня ў Мінскім гарадскім судзе. Рашэнне будзе прымаць Інна Ігнавенка[101]. Тым часам прарасійская актывістка Вольга Бондарава распачала барацьбу супраць кіраўніка агенцтва падзейных праектаў «Альтэр Эга» Аляксандра Рака. У сваім тэлеграм-канале яна напісала: *«Компания Рака делает фестивали, где постоянно протаскивают националистическую, пропольскую тему: “Свята Сонца”, “Наш Грунвальд”, “Нясвіжская фартэцыя”, “Менск Старажытны”»*[102]. Варта адзначыць, што прарасійскія актывісты (а следам за імі і беларускія ўлады) варожа рэагуюць на любыя пазітыўныя згадкі беларускай шляхты альбо тэмы рыцарства на тэрыторыі Беларусі і паслядоўна вынішчаюць гэтую старонку нашай гісторыі, таму што яна яднае нас з краінамі Заходняй Еўропы, а не з Расіяй.

[98] https://reformby.org/u-pragrame-brjesckaga-tjeatralnaga-festyvalju-belaja-vezha-nechakana-z-javi-sja-tjeatr-z-polshy-ale-spektakl-admeneny
[99] https://t.me/bolshoibelarus/25930
[100] https://t.me/bolshoibelarus/25959
[101] https://t.me/viasna96/27069
[102] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/32553

***

**«Беларусьфільм» спадзяецца павысіць турыстычную прывабнасць краіны сумесным фільмам з Кітаем.**

Аб гэтым заявіў генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Юрый Аляксей. *«Мы покажем красоту нашей страны, знаковые локации Бреста, Минска и надеемся, что это повысит их туристическую привлекательность. Мы познакомим зрителя с беларусской культурой, традициями, фольклором. А коллеги из Китая, в свою очередь, познакомят беларусов со своей культурой»,* — сказаў ён. Па словах Аляксея, галоўныя пачуцці, якія стваральнікі сумеснага фільма хочуць выклікаць у гледача, — гэта *«любовь к Родине, ценность дружбы и взаимовыручки». «Самое главное — это укрепить дружбу двух народов и задать такой темп, чтобы мы не останавливались на достигнутом»,* — падкрэсліў ён[103]. Нагадаем, што яшчэ 20 лістапада, падчас Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», Беларусь і Кітай падпісалі пагадненні аб намерах сумеснай кінавытворчасці[104]. Тады ж стала вядома, што сумесная карціна будзе называцца «На вякі вечныя», сімвалізуючы *«доўгайграючае сяброўства Беларусі і Кітая»*[105].

***

**У духоўна-асветніцкім цэнтры «Каўчэг» Свята-Елісавецінскага манастыра ў Мінску адкрылася выстава графічных работ Юліі Таўстоўсавай «Люди, опалённые войной» і экспазіцыя карцін Святланы Жыгімонт «Когда пойду долиной смертной тени».**

Творы расійскай і беларускай мастачак прысвечаны Данбасу[106] *(«падзеям спробы дзяржаўнага перавароту 2020 года і агрэсіі нацысцкай Украіны супраць мірнага насельніцтва Данбаса»[107]).*

Іншыя выставы, якія адкрыліся ў гэты перыяд і на якія варта звярнуць увагу:

- Музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» (г. Брэст) — выстава «Рускі імпрэсіянізм»[108].

- Мастацкі музей (Віцебск) — выстава «Рэпін і вучні»[109].

---

[103] https://reformby.org/belarusfilm-nadeetsja-povysit-turisticheskuju-privlekatelnost-strany-sovmestnym-filmom-s-kitaem
[104] https://t.me/radiosvaboda/65102
https://t.me/minkultrb/26745
https://t.me/minkultrb/26762
[105] https://reform.by/kitaj-i-belarus-planujuc-znjac-sumesny-film-na-vjaki-vechnyja
[106] https://t.me/RusEmbassyMinsk/5184
[107] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/32440
[108] https://t.me/kultinfa/7956
[109] https://t.me/kultinfa/8016

- Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр — выстава твораў беларускіх мастакоў «Фарбы Вялікай Перамогі»[110].

- Музей гісторыі горада Брэста — выстава «У нас ёсць адна толькі мэта — Перамога»[111].

- Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны працягнуў працу часовай экспазіцыі «Мы набліжалі Перамогу». Выстава прымеркаваная да 80-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[112].

***

**Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Ґігін залічыў беларускага першадрукара Францыска Скарыну стваральнікам «рускай цывілізацыі» і чарговы раз паспрабаваў выштурхнуць з нацыянальнай літаратуры Ларысу Геніюш.**

*«6 августа 1517 года Франциск Скорина издал в Праге свою первую печатную книгу. Это — “Псалтырь”. Важно, что книга была отпечатана на кириллице. Это обозначило нашу принадлежность к русской цивилизации»,* — напісаў ён у сваім тэлеграм-канале[113]. Таксама Вадзім Гігін яшчэ раз патлумачыў свае прэтэнзіі да беларускай паэткі Ларысы Геніюш, імя якой сёння старанна выціраецца прарасійскімі актывістамі і афіцыйнымі ўладамі: *«Гениуш пребывала в нацистском “обозе”. Она не расстреливала, не жгла, не вешала. Но и не желала победы нашим войскам. Видела все зверства оккупантов, но тогда в её душе ничего не шевельнулось. Она не стала бойцом Сопротивления, не написала антифашисткое стихотворение. Зато после войны позволила себе вылить на белорусских партизан, наших героев, ушат грязи. И лично я никаких её стихов видеть не хочу»*[114]. Нагадаем, што раней Вадзім Гігін выказваў прэтэнзіі ў адрас Геніюш у красавіку ў інтэлектуальным дыялогу на хвалі канала «Культура»[115].

[110] https://t.me/kultinfa/7961
[111] https://t.me/kultinfa/8006
[112] https://t.me/kultinfa/8012
[113] https://t.me/Gigin_Vadim/1448
[114] https://t.me/Gigin_Vadim/1477
[115] https://nashaniva.com/339907

**Каравай-фэст «Бацькава булка» ў Свіслачы быў прысвечаны 30-годдзю Прэзідэнцтва і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пры падтрымцы Рускага Дома ў Гомелі ўсталююць помнік яго заснавальнікам (толькі невядома — каму), Лукашэнка сказаў, што беларусы нічым не адрозніваюцца ад рускіх, у школьнай праграме па гісторыі з'явіліся пытанні «Супраціўленне беларускага народа германскай акупацыі» і «Супраціўленне беларускага народа польскай акупацыі», з-за масавых звальненняў і ідэалагічнага «сіта» ў гістарычных музеях краіны не хапае дзясяткаў супрацоўнікаў, у Мінску прайшоў адборачны тур конкурсу выканаўцаў маладзёжнай песні фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», этна-фестываль «Карані» быў адменены, у Расійскім нацыянальным музеі музыкі ў Маскве адкрылася выстава «Песняры-55», афіцыйныя ўлады рыхтуюцца да святкавання Дня народнага адзінства, а на кінастудыі «Беларусьфільм» актыўна працуюць над некалькімі фільмамі — навіны культуры за перыяд 11-20 жніўня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд **11-20 жніўня 2024 года** на афіцыйным сайце[116] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 2 навіны:

- Міністэрства культуры абвясціла конкурсны адбор рэжысёрскіх канцэпцый рэспубліканскіх мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (май 2025 года)[117].

- Міністэрства культуры абвясціла конкурсны адбор рэжысёрскіх канцэпцый культурных мерапрыемстваў у 2025 годзе: мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь; Рэспубліканскага свята выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі[118].

Афіцыйны тэлеграм-канал[119] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 69 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў,

---

[116] https://www.kultura.by/

[117] https://www.kultura.by/news/ministerstvo-kultury-obyavlyaet-konkursnyy-otbor-rezhisserskikh-kontseptsiy-respublikanskikh-meropri/

[118] https://www.kultura.by/news/ministerstvo-kultury-obyavlyaet-konkursnyy-otbor-rezhisserskikh-kontseptsiy-kulturnykh-meropriyatiy-/

[119] https://t.me/MinobrofBelarus

змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 54 |
| Беларуская | 11 |
| Абедзве | 4 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 1 навіна;

• культурная тэматыка — 44 навіны;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 4 навіны;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 10 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандр Бартошык:***

- Выступіў з дакладам на нарадзе «Аб стане работы па ўмацаванні бяспекі і дысцыпліны і ходзе выканання патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. нумар 1 “Аб мерах па ўмацаванню грамадскай бяспекі і дысцыпліны”», якая праводзілася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі[120].

**Культурная тэматыка** прысутнічала ў 44 навінах.18 з іх былі прысвечаны святкаванню VIII Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Кліч Палесся», які прайшоў у вёсцы Ляскавічы Петрыўскага раёна.

- Мінская абласная бібліятэка на працягу ўсяго года праводзіць юбілейныя мерапрыемствы, прысвечаныя 225-годдзю з дня нараджэння рускага

---

[120] https://t.me/minkultrb/40993

паэта Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна, у тым ліку літаратурна-пазнавальныя экскурсіі «Пушкін і сучаснасць»[121].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- На мемарыяле «Партызанская крыніца» пад Гомелем прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя 83-й гадавіне з дня ўтварэння партызанскага атрада «Бальшавік», які граміў ворага на тэрыторыі Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны[122].

- У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адбыўся пленэр, прысвечаны 80-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Арганізатарамі пленэру выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь. У пленэры прынялі ўдзел 12 аўтараў: члены Беларускага саюза мастакоў, студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. На пленэры было анансавана адкрыццё мастацкай выставы ў НЦСМ «Жывыя, пакуль памятаем»[123,124].

- Каравай-фест «Бацькава булка», які прайшоў у Свіслачы пад лозунгам «Мір. Гаспадар. Дабрабыт», быў прысвечаны 30-годдзю Прэзідэнцтва, а таксама 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[125].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 10 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 5 навін;

Пакістан — 2 навіны;

Сербія — 1 навіна;

Кітай — 1 навіна;

Індыя — 1 навіна.

***Расія:***

- Генеральны дырэктар Гомельскага дзяржаўнага цырка Анастасія Сарасека падпісала пагадненне з дырэктарам прадзюсерскага цэнтра «Каралеўскі цырк Гіі Эрадзэ», заслужаным артыстам Расіі Гіяй Эрадзэ на

[121] https://t.me/minkultrb/40884
[122] https://t.me/minkultrb/40832
[123] https://t.me/minkultrb/40847
[124] http://ncsm.by/calendar/vystava-zhyvyya-pakul-pamyataem
[125] https://t.me/minkultrb/40876

правядзенне гастроляў праграмы «5 кантынентаў» з артыстамі Расійскай дзяржаўнай цыркавой кампаніі ў горадзе Гомелі ў 53-м цыркавым сезоне[126].

- Адбыўся тэлемост паміж кіраўніцтвам Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Пермскай краёвай спецыяльнай музычнай школы. Калегі падзяліліся інфармацыяй аб дзейнасці сваіх устаноў, абмеркавалі пытанні арганізацыі мерапрыемстваў, праграм і праектаў, накіраваных на выяўленне і падтрымку таленавітай моладзі ў галіне музычнага мастацтва, правядзенне сустрэч, фестываляў, форумаў, канферэнцый, майстар-класаў, круглых сталоў, семінараў, конкурсаў[127].

- У Музеі Перамогі ў Маскве стартаваў фестываль Саюзнай дзяржавы «Творчасць юных». У гэтым годзе ён прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Удзельнікамі фестывалю сталі юныя вакалісты і музычныя калектывы з Беларусі і Расіі. *«Фестываль закліканы развіваць культурнае супрацоўніцтва творчай моладзі Беларусі і Расіі, аб'яднаць намаганні па падтрымцы творчай актыўнасці і ініцыятывы, а таксама захаваць агульную культурную прастору дзвюх краін у рамках Саюзнай дзяржавы»,* — адзначылі арганізатары[128,129].

- У горадзе Сцерлітамак (Рэспубліка Башкартастан, РФ) адбыўся вялікі фестываль гасціннасці «Купец 2.0». Упершыню ў горадзе прайшоў вялікі парад у нацыянальных строях з удзелам калектываў рэгіёнаў Расіі і краін блізкага замежжа. Ад Беларусі ў фестывалі прыняў удзел народны вакальна-інструментальны ансамбль «Славянская песня» дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры Гомельскага раёна»[130].

***Пакістан:***

- Парламенцкая дэлегацыя Пакістана наведала музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску[131].

- У арт-прасторы Парка культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў адкрылася фотавыстава «Погляд на Пакістан». У цырымоніі прыняў удзел спікер Нацыянальнай Асамблеі Пакістана Сардар Айяз Садзік, які знаходзіцца з візітам у Беларусі. Пасол Пакістана ў Беларусі Саджад Хайдэр Хан: *«Выстава пазнаёміць жыхароў Беларусі з багатай культурнай спадчынай Пакістана — пейзажамі, помнікамі архітэктуры, нацыянальным каларытам».*[132]

[126] https://t.me/minkultrb/40809
[127] https://t.me/minkultrb/40812
[128] https://t.me/minkultrb/40846
[129] https://www.belta.by/society/view/festival-sojuznogo-gosudarstva-tvorchestvo-junyh-posvjatjat-80-letiju-osvobozhdenija-belarusi-654219-2024/
[130] https://t.me/minkultrb/40972
[131] https://t.me/minkultrb/40975
[132] https://t.me/minkultrb/40983

***Сербія:***

- Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў рамках рабочага візіту наведала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна Вукайловіч. У рамках візіту бакі выказалі ўпэўненасць у далейшым плённым супрацоўніцтве[133].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 11 па 20 жніўня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў:

**- Акцыя «Ноч кіно».** Акцыя «Ноч кіно» традыцыйна прымеркавана да святкавання Дня расійскага кіно. Стала вядома, што сёлета ў акцыі прымуць удзел не толькі рэгіёны Расіі, а таксама 14 краін БРІКС і СНД. У Беларусі да акцыі далучацца Брэст, Гомель, Гродна, Мінск і Магілёўская вобласць. У Рускім Доме ў Мінску адбудзецца паказ рускай народнай казкі «По щучьему велению» рэжысёра Аляксандра Вайцінскага[134]. У Доме Масквы ў Мінску адбудзецца паказ сучаснага расійскага фільма «Сто лет тому вперед» паводле твораў Кіра Булычова[135].

**- Памятнае мерапрыемства, прысвечанае 83-годдзю подзвігу ўраджэнца Ніжагародскай вобласці Зіновія Калабанава** *(Мінск, Чыжэўскія могілкі).* Супрацоўнікі прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўніцтва Ніжагародскай вобласці ў Рэспубліцы Беларусь, міжнароднай грамадскай арганізацыі «Братэрства беларусаў і расіян» ушанавалі памяць героя вайны хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да яго магілы. *«Особенно актуально сохранение памяти о героизме предков в год 80-летия освобождения Белорусской ССР от немецко-фашистских захватчиков и в преддверии празднования 80-й годовщины Победы советского народа в Великой Отечественной войне»*, — адзначыў у сваім выступленні намеснік кіраўніка Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва Міхаіл Быстроў[136].

**- Паказ беларускім школьнікам расійскіх фільмаў** *(Гомель).* Школьнікі з сярэдняй школы №74 Гомеля наведалі кінаклуб «Афіша», які дзейнічае пры

[133] https://t.me/minkultrb/40856
[134] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14516
[135] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14520
[136] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14538

Рускім Доме ў Гомелі. Для іх быў арганізаваны паказ расійскага кароткаметражнага фільма «Счастье — это...»[137].

**- Установка помніка заснавальнікам Гомеля.** Стала вядома, што пры падтрымцы Рускага Дома ў Гомелі ў горадзе ўсталююць помнік яго заснавальнікам. З гэтай нагоды адбылася сустрэча саветніка-пасланніка Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Уладзіміра Ваньке, саветніка пасольства Сяргея Афоніна, кіраўніка Рускага Дома ў Гомелі Вольгі Бараненкі са старшынёй Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Аленай Алексінай і прадстаўнікамі Гомельскай епархіі. *«Добрососедские отношения наших братских народов заложены исторически, и важно эти корни беречь»,* — падкрэсліў Уладзімір Ваньке. У ходзе сустрэчы з гасцямі было дасягнута ўзаемаразуменне ва ўсіх пытаннях для далейшага супрацоўніцтва[138]. Пры гэтым, Рускі Дом не назваў прозвішчы тых самых «асоб» і не патлумачыў, чаму менавіта іх лічаць заснавальнікамі Гомеля. Верагодна, размова ідзе як мінімум пра двух славутых расійскіх дзеячаў — военачальнікаў Івана Паскевіча і Пятра Румянцава. Яны былі ўладальнікамі Гомеля, але ніяк не ягонымі заснавальнікамі. Калі гаворка сапраўды пра іх, то ў наяўнасці скажэнне фактаў, «перапісванне» гісторыі і яе фальсіфікацыя. Гомель хочуць прадставіць расійскім, нібыта заснаваным расіянамі, хаця са сваёй прыкладна 1000-гадовай гісторыі ён быў у складзе Расіі ўсяго паўтара стагоддзя[139].

**- Курсы павышэння кваліфікацыі для выкладчыкаў рускай мовы.** Пры падтрымцы Рассупрацоўніцтва курсы ў Ніжнім Ноўгарадзе наведала брэсцкі педагог па рускай мове і літаратуры; курсы ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце — трое выкладчыкаў з Гродна[140].

**- 3-і Рэспубліканскі каравай-фестываль «Бацькава булка»** *(г. Свіслач)*. Гродзенскае аддзяленне РГА «Рускае таварыства» сумесна з навучэнцамі Гродзенскага гуманітарнага каледжа і нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб'яднаннямі прынялі ўдзел у запаўненні сімвалічнай хлебнай карты Беларусі. Расійскія актывісты ўпрыгожылі фрагмент беларускай карты рускім «Барадзінскім» хлебам[141].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 11-20 жніўня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

[137] https://t.me/russiangomel/4592
[138] https://t.me/russiangomel/4611
[139] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/gorad/uzhe-ne-lodochnik-v-gomele-anonsirovali-ustanovku-pamjatnika-osnovateljam-goroda-no-ne-nazvali-kogo-imi-schitajut.html
[140] https://t.me/russkiydomvgrodno/1592
[141] https://t.me/russkiydomvgrodno/1612

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**У інтэрв'ю тэлеканалу «Расія» Лукашэнка сказаў, што беларусы нічым не адрозніваюцца ад рускіх.**

Адказваючы на пытанне прапагандыста Яўгенія Папова, Лукашэнка дагаварыўся да таго, што адмовіў беларусам у якой-небудзь увогуле адметнасці. *«Як некаторыя гавораць — мы рускія людзі, чым мы адрозніваемся? А нічым».* Свае колішнія словы пра тое, што, маўляў, «беларусы — рускія са знакам якасці», ён цяпер назваў жартам, і паўтарыў пасля таго яшчэ раз, што ніякіх адрозненняў паміж беларусамі і рускімі няма[142].

***

**У школьнай праграме па гісторыі ў Беларусі з'явіліся пытанні «Супраціўленне беларускага народа германскай акупацыі» і «Супраціўленне беларускага народа польскай акупацыі».**

*«Это важно с учетом того, что "БНР" была производной от германской оккупации, а затем действовала под польской эгидой»,* — так адрэагаваў на гэтую навіну расійскі гісторык Аляксандр Дзюкаў, кіраўнік расійскага фонду «Историческая память»[143].

***

**З-за масавых звальненняў і ідэалагічнага «сіта» ў гістарычных музеях краіны не хапае дзясяткаў супрацоўнікаў.**

Так, у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі шукаюць чатырох музейных наглядчыкаў, трох старэйшых навуковых супрацоўнікаў, аднаго навуковага супрацоўніка і сем — малодшых. У Гродзенскім музеі гісторыі рэлігіі ў асноўным шукаюць малодшых і старэйшых навуковых супрацоўнікаў, адкрыты вакансіі кіраўнікоў — намесніка дырэктара па навуковай дзейнасці і загадчыкаў аддзеламі. У Нацыянальным гістарычным музеі, адкуль за апошнія гады былі звольнены дзясяткі чалавек, 14 вакансій, у тым ліку навуковыя супрацоўнікі, архіварыус і

[142] https://nashaniva.com/349306
[143] https://t.me/historiographe/14725

мастак-рэстаўратар. У нацыянальна-гістарычным архіве, дырэктарам якога з'яўляецца Міхаіл Глушакоў, што працаваў да гэтага кансультантам аднаго з дэпартаментаў Міністэрства юстыцыі, а раней працяглы час служыў у КДБ, патрабуюцца намеснік дырэктара архіва па навуковай дзейнасці, загадчык аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі, намеснік загадчыка аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі, загадчыкі аддзела, сектара і архівасховішча. Нагадаем, што пасля прызначэння новага дырэктара з архіва былі звольнены адразу восем чалавек. Да чаго гэта можа прывесці? Сітуацыя можа развівацца ў даволі небяспечным кірунку, бо пасля разгрому ўладамі Беларусі няўрадавых арганізацый у краіне і дэградацыі дзяржаўных музейных устаноў іх нішу спрабуюць заняць Расійскія цэнтры навукі і культуры — Рускія Дамы[144].

***

**У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску прайшоў адборачны тур конкурсу выканаўцаў маладзёжнай песні фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».**

Па ініцыятыве Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі з 11 па 15 верасня 2024 года на тэрыторыі Смаленскай вобласці пройдзе XVII Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Склад дэлегацыі ад Беларусі фарміруе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. У мерапрыемствах фестывалю прымуць удзел дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, дзяржаўныя, грамадскія і палітычныя дзеячы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый рэгіёнаў Расіі і Беларусі, маладзёжныя мастацкія калектывы, студэнты, удзельнікі і пераможцы маладзёжных конкурсных мерапрыемстваў СД, вядомыя артысты і дзеячы культуры[145].

***

**7-ы этна-фестываль «Карані», які павінен быў прайсці з 16 па 25 жніўня на берагах ракі Вілія ў Маладзечанскім раёне, быў адменены.**

Паведамленне аб гэтым з'явілася на сайце арганізатараў мерапрыемства. Прычынай адмены ўказваецца факт не ўзгаднення правядзення фестывалю на фінальным этапе. Этна-культурны фестываль «Карані» — мерапрыемства, гасцям якога прапануецца шырокая праграма, у рамках якой можна прыняць удзел у беларускіх традыцыйных практыках, разжыцца вырабамі рамеснікаў і атрымаць асалоду ад народнай музыкі[146]. *«Просто констатирую качественную работу идеологии по пресечению распространения бчб-идей под видом т. н. «этно-фэстов» и палаточных*

---

[144] https://reformby.org/u-gistarychnyh-muzejah-krainy-ne-hapae-dzjasjatka-supraco-nika-hto-ih-mozha-zamjanic
[145] https://www.belta.by/culture/view/vosem-ispolnitelej-predstavjat-belarus-na-konkurse-molodezhnoj-pesni-sg-654206-2024/
[146] https://npr.by/7-j-etno-festival-karani-otmenen/

*лагерей»,* — выказалася з гэтай нагоды ў сваім тэлеграм-канале прарасійская актывістка Вольга Бондарава[147].

***

**У Расійскім нацыянальным музеі музыкі ў Маскве адкрылася выстава «Песняры-55», падрыхтаваная Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі.**

Яна прымеркавана да 55-гадовага юбілею знакамітага музычнага калектыву, які будзе адзначацца 1 верасня. «У нас лунала ідэя, што ў Маскву трэба прывезці "душу беларускага народа", і амаль адразу мы зразумелі, што гэта "Песняры", улічваючы, што сёлета іх юбілей, — расказаў на вернісажы журналістам дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Аляксандр Храмой. — Гэта першая музычная выстава музея. Спадзяюся, што яна спадабаецца масквічам, і зыходзячы з гэтага мы будзем вызначаць далейшыя перспектывы супрацоўніцтва з Расійскім музеем музыкі»[148].

***

**Афіцыйныя ўлады рыхтуюцца да святкавання Дня народнага адзінства.**

У ваенна-гістарычным комплексе «Старая мяжа» (Дзяржынскі раён) — філіяле Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі ВАВ — пройдзе мерапрыемства «Гісторыя. Развіццё. Незалежнасць». Госці змогуць наведаць выставу пад адкрытым небам «Навекі разам», прысвечаную *"85-годдзю аднаўлення гістарычнай справядлівасці — аб'яднанню Беларусі"*, убачыць тэатралізаваную пастаноўку «Памежная застава», якая раскажа пра жыццё і побыт памежнікаў 30-х гадоў XX стагоддзя, а таксама пагрузіцца у культурную і гістарычную спадчыну краіны з дапамогай квэста «Пазнай Беларусь». Мерапрыемства «Гісторыя. Развіццё. Незалежнасць» праводзіцца супрацоўнікамі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сумесна з Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь[149,150]

***

**На кінастудыі «Беларусьфільм» актыўна працуюць над некалькімі ігравымі, дакументальнымі і анімацыйнымі фільмамі.**

---

[147] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/32991
[148] https://www.belta.by/culture/view/dusha-belorusskogo-naroda-v-moskve-otkrylas-vystavka-pesnjary-55-655506-2024/
[149] https://www.warmuseum.by/news/afisha/priglashaem_na_den_narodnogo_edinstva_na_vik_staraya_granitsa/
[150] https://www.belta.by/society/view/istorija-razvitie-nezavisimost-chto-gotovit-muzej-istorii-vov-ko-dnju-narodnogo-edinstva-655241-2024/

Паводле слоў генеральнага дырэктара «Беларусьфільма» Юрыя Аляксея, частка фільмаў знаходзіцца на стадыі актыўнай вытворчасці, а іншыя — яшчэ ў распрацоўцы. *«На дадзены момант у нас у вытворчасці каля 12 дакументальных фільмаў. Усе яны вельмі важныя і датычацца актуальных тэм. Ёсць карціны пра нашых герояў: паралімпійца Аляксея Талая, барацьбіта Аляксандра Мядзведзя і не толькі. Ёсць тэма генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, мы не стомімся нагадваць усяму свету, як гэта было. Таксама ідзе праца над карцінай аб вытворчасці кіно, аб тым, як жыла наша кінастудыя на працягу ста гадоў»*, — распавёў ён. Да снежня чакаецца выхад гістарычнага блокбастара «Чорны замак». Карціну маюць намер адправіць на міжнародныя фестывалі, у тым ліку ў Індыю, на Гоа. Акрамя таго, зараз на кінастудыі працуюць над кітайска-беларускім праектам. Адпаведную дамову падпісалі на кінафестывалі «Лістапад»[151,152]. Зусім хутка беларуская кінастудыя і кітайскія калегі пачнуць здымкі. Праект будзе маштабным: каля 400 спецыялістаў прымуць удзел з боку Кітайскай Народнай Рэспублікі, яшчэ каля 100 кіношнікаў — з беларускага боку. Акцёр кіно і тэлебачання, прадзюсер Лэй Хань адзначыў, што галоўная мэта — паказаць, як пры дружным і мірным суіснаванні двух народаў можна забяспечыць стабільнасць ва ўсім свеце, парадак, бо гэта галоўныя каштоўнасці, якіх павінна прытрымлівацца чалавецтва: *«Мы хочам паказаць, як дружныя нашы народы. Усяму свету прадэманстраваць, чым жывуць нашы краіны, паказаць прыгажосць прыроды Кітая і Беларусі, багацце традыцый, гістарычнай спадчыны»*[153].

***

**Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» падпісала мемарандум аб вытворчасці фільма «Бацька Мінай» з генеральным дырэктарам студыі «ВаенФільм», народным артыстам РФ Ігарам Угольнікавым.**

Генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Юрый Аляксей падкрэсліў, што Расія — асноўны стратэгічны партнёр Беларусі, таму *«любое ўзаемадзеянне дзвюх краін будзе карысным». «Праект умацуе сяброўства і адносіны паміж двума народамі і раскажа пра іх подзвіг, пакажа прыклад патрыятызму для нашай моладзі. Фільм выйдзе на рускай мове з англійскімі і кітайскімі субтытрамі. Першыя здымкі пачнуцца ў верасні-кастрычніку ў Беларусі»*, — падсумаваў Юрый Аляксей[154].

---

[151] https://news.zerkalo.io/cellar/75683.html?tg=9
[152] https://www.belta.by/culture/view/istorija-belorusskogo-kino-i-sotrudnichestvo-s-aziej-chto-snimajut-na-belarusfilme-653744-2024/
[153] https://www.sb.by/articles/belarusfilm-priglashaet-akterov-na-kasting-dlya-semki-v-pervom-sovmestnom-belorussko-kitayskom-filme.html
[154] https://www.belta.by/society/view/ugolnikov-o-filme-batka-minaj-my-nachinaem-podgotovku-k-sjemkam-kartiny-654017-2024/

**У школах уводзяць штомесячныя інфармгадзіны аб генацыдзе беларускага народа, у вучэбнай праграме «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» не знайшлося месца для БНР, гасцям Дня беларускага пісьменства паказалі ваенна-гістарычную рэканструкцыю вызвалення Івацэвіцкага раёна, адміністрацыя віцебскай калоніі варожа ставіцца да беларускай мовы, знакаміты верш Янкі Купалы «Хто ты гэткі» прызналі экстрэмісцкім, як і Instagram-старонку мастака Уладзіміра Цэслера, стала вядома, пра што будзе сумесны беларуска-кітайскі фільм «На вякі вечныя», у Мінску прэзентавалі стужку «Культурны код» аб дзяржаўных сімвалах, у Гомелі адкрыўся кінатэатр пад адкрытым небам, дзе на першым сеансе паказалі савецкі фільм, на сцэне Вялікага тэатра Беларусі загучаць рускія рамансы, расійскі рэжысёр паставіць у Купалаўскім тэатры спектакль па Дастаеўскаму, у Мінску на Дзень горада правядуць Дні Екацярынбурга — навіны культуры за перыяд 21-31 жніўня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд **21-31 жніўня 2024 года** на афіцыйным сайце[155] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь было апублікавана 0 навін. Афіцыйны тэлеграм-канал[156] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 107 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных на тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 76 |
| Беларуская | 23 |
| Абедзве | 8 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

[155] https://www.kultura.by/

[156] https://t.me/MinobrofBelarus

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 12 навін;

• культурная тэматыка — 39 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 5 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 31 навіна.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***

- прыняў удзел ва ўрачыстым адкрыцці свята ў гонар 980-годдзя горада Навагрудка[157]. *(Маркевіч: «Навагрудчына — калыска беларускай дзяржаўнасці»)*[158].

- выступіў з прывітальным словам на жнівеньскім форуме педагагічных работнікаў у сферы культуры[159].

- наведаў з рабочым візітам Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», дзе адбылася сустрэча з калектывам музея, адной з тэм абмеркавання была: «Інфармацыйная гігіена або як не стаць ахвярай дэзынфармацыі»[160,161].

***Начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына Карповіч:***

- прыняла ўдзел у пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры, якое прайшло ў Нацыянальным мастацкім музеі, дзе расказала аб праблемах і перспектывах у працы музеяў[162].

***Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Марына Юркевіч:***

- правяла прамую тэлефонную лінію па пытаннях устаноў адукацыі сферы культуры[163].

[157] https://t.me/minkultrb/41139
[158] https://t.me/minkultrb/41141
[159] https://t.me/minkultrb/41267
[160] https://t.me/minkultrb/41321
[161] https://t.me/minkultrb/41356
[162] https://t.me/minkultrb/41033
[163] https://t.me/minkultrb/41071

- выступіла з дакладам на жнівеньскім форуме педагагічных работнікаў у сферы культуры[164].

***Начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Ірына Дрыга:***

- выступіла з дакладам «Аб магчымасцях і перспектывах супрацоўніцтва ў галіне крэатыўных індустрый» на першым Маскоўскім міжнародным тыдні кіно, які праходзіў у Маскве[165].

- сустрэлася ў Міністэрстве культуры Расійскай Федэрацыі з дырэктарам Дэпартамента кінематаграфіі і лічбавага развіцця Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі Д. Давыдзенкам і яго намеснікамі. Бакамі абмяркоўваліся пытанні: развіцця сумеснай вытворчасці фільмаў і аказання падтрымкі ў стварэнні сумесных кінапракатаў за кошт сродкаў міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Фонду кіно Расіі; стварэння цэнтраў расійскага кіно ў рэгіёнах Беларусі і цэнтраў беларускага кіно ў рэгіёнах Расійскай Федэрацыі; аказання садзейнічання з боку Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі ў запрашэнні расійскіх прадзюсараў, кінарэжысёраў і акцёраў на XXX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» і арганізацыі круглага стала вытворцаў фільмаў, пракатчыкаў, арганізатараў кінафестываляў у рамках фестывалю. *«Выпрацаваныя ў ходзе сустрэчы напрамкі сумеснай работы паслужаць далейшаму развіццю беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў галіне вытворчасці і пракату фільмаў»*[166].

**Культурная тэматыка** прысутнічала ў 39 навінах. На што варта звярнуць увагу:

- шырокае асвятленне прэм’еры новай працы кінастудыі «Беларусьфільм» — прапагандысцкага фільма «Культурны код» *(«Так о наших символах не говорил ещё никто! Смотрите трейлер фильма — и проникайтесь атмосферой»)*[167]. У кінатэатры «Беларусь» адбылася прэс-канферэнцыя і прэс-паказ фільма. Спікерамі, сярод іншых, выступілі: генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Ю. Аляксей, рэжысёр-пастаноўшчык К. Халецкі, дэпутат Мінскага гарадскога савета дэпутатаў Б. Ярэміч, прадзюсар і акцёр з КНР Лэй Хань[168]. Перадпрэм’ерны паказ фільма і сустрэча з яго стваральнікамі адбыліся і ў Івацэвічах на Свяце беларускага пісьменства[169].

---

[164] https://t.me/minkultrb/41266
[165] https://t.me/minkultrb/41171
[166] https://t.me/minkultrb/41210
[167] https://t.me/minkultrb/41005
[168] https://t.me/minkultrb/41197
[169] https://t.me/minkultrb/41405

- У прэс-цэнтры РУП «Дом прэсы» прайшла прэс-канферэнцыя на тэму: «Беларусь шматаблічная: узаемадзеянне культур і рэлігій». У мерапрыемстве прынялі ўдзел: намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Сяргей Герасіменя; дырэктар дзяржаўнай установы змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» Вольга Якабсон; старшыня грамадскага аб'яднання «Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства "Айястан"», старшыня Кансультатыўнай міжэтнічнай рады пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Георгій Егіазаран; старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра» Уладзіслаў Кадзіра; старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Горо» Хізры Асадулаеў[170]. Тэма абмеркавання — стан наяўнай канфесійнай сітуацыі і яе ўплыў на культурныя працэсы Беларусі, планаванне мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускай культуры ў бліжэйшы час у замежных дзяржавах і г. д.[171].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адбылася прэзентацыя выставы «Жывыя, пакуль памятаем» *(«Гэта экспазіцыя пра трагедыю чалавека падчас вайны. Гэта бясконцая падзяка мільёнам людзей, якія змагаліся за нашу будучыню, напамін пра тое, як важна захоўваць гістарычную памяць»)*[172].

- на Дні горада Капыля працавала мабільная экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Наш абавязак — памятаць», створаная на аснове фондавых матэрыялаў Музея і абноўленая ў гонар святкавання 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[173]. Гэтая ж экспазіцыя працавала і ў Івацэвічах у рамках Дня беларускага пісьменства. А для юных наведвальнікаў там была адкрыта інтэрактыўная зона «Музей для дзяцей» і тэматычная фотазона[174] *(«Ребята с удовольствием мастерили памятные открытки, фотографировались в военной форме, играли и узнавали много нового»[175])*.

- на Кургане Славы прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: выступленні творчых калектываў, выставы-продажы, майстар-класы, дэгустацыі і інтэрактывы ад прадпрыемстваў і ўстаноў. Свае экспазіцыі прадстаўлялі Дзяржынскі, Нясвіжскі, Салігорскі, Уздзенскі раёны, а таксама горад Жодзіна[176].

---

[170] https://t.me/minkultrb/41006
[171] https://t.me/kultinfa/8170
[172] https://t.me/minkultrb/41042
[173] https://t.me/minkultrb/41104
[174] https://t.me/minkultrb/41357
[175] https://t.me/minkultrb/41146
[176] https://t.me/minkultrb/41152

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** была прысвечана 31 навіна (з 44 за ўвесь месяц), якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 19 навін;

Узбекістан — 6 навін;

Кітай — 5 навін;

Сербія — 1 навіна.

***Расія:***

- У Маскве, у Музеі Перамогі, прайшоў Фестываль Саюзнай дзяржавы «Творчасць юных». Сёлета ён быў прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі. Дэлегацыя з Рэспублікі Беларусь арганізавала канцэрт «Сонца каласы»[177]. Удзельнікі Фестывалю прынялі ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі ўнясення гісторый сваіх продкаў, якія ваявалі ў Вялікай Айчыннай вайне, ва Усенародны гістарычны праект «Асобы Перамогі». Завяршылася мерапрыемства ў Зале Славы, дзе адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да Помніка Салдату-Пераможцу[178,179].

- у Астрахані (РФ) прайшоў Міжнародны фестываль класічнага мастацтва «Каспійскія сезоны». Упершыню ў фестывалі прынялі ўдзел госці з Беларусі і Узбекістана. У Астраханскай філармоніі прайшоў канцэрт «Дзень Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан»[180,181].

- у Мастацкім музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы «Выяўленчае мастацтва Мардовіі», арганізаванай пры ўдзеле Мардоўскага рэспубліканскага музея выяўленчых мастацтваў ім. С. Д. Эр'зі і Саюза мастакоў Рэспублікі Мардовія. У экспазіцыі выставы прадстаўлена 60 твораў жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ад аўтараў, якія з'яўляюцца дзейнымі членамі Саюза мастакоў Расіі[182,183].

- стала вядома, што з 4 па 7 верасня ў Гомелі пройдзе II Міжнародны фестываль-конкурс аматарскага цыркавога мастацтва «Сузор'е Слана». Фестываль створаны для падтрымкі аматарскіх цыркавых калектываў, павышэння іх мастацкага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства, абмену

---

177 https://t.me/minkultrb/41008
178 https://t.me/minkultrb/41018
179 https://t.me/minkultrb/41145
180 https://t.me/minkultrb/41198
181 https://t.me/minkultrb/41245
182 https://t.me/minkultrb/41205
183 https://t.me/minkultrb/41232

досведам, наладжвання творчых кантактаў. На гэты раз удзел у ім прымуць калектывы з Бурацii, Ульянаўска, Дагестана[184].

- у час святкавання Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах народны артыст Расii і прадзюсар Ігар Угольнікаў правёў творчую сустрэчу[185].

- у мэтах пашырэння міжрэгіянальнага супрацоўніцтва паміж Віцебскай і Пскоўскай абласцямі ў Пскове прайшлі Дні Віцебскай вобласці, у рамках якіх адбыліся канцэрты з удзелам Віцебскай абласной філармоніі. У Фінскім парку Пскова працавала тэматычная экспазіцыя «Спадчына Віцебшчыны», прадстаўленая ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»; часовая выстава, арганізаваная Віцебскім абласным краязнаўчым музеем; тэматычныя пляцоўкі Гарадоцкага, Верхнядзвінскага і Полацкага раёнаў. Адбылося таксама адкрыццё выставы «Маэстра Фелікс Гумен. Віцебская акварэль» са збору Віцебскага абласнога краязнаўчага музея[186]. А ў Пскоўскай абласной універсальнай навуковай бібліятэцы імя В. Я. Курбатава прайшоў міжнародны круглы стол «80-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца», які аб'яднаў беларускіх і расійскіх бібліятэкараў, краязнаўцаў, гісторыкаў. Прадстаўнікі Віцебскай і Пскоўскай абласных бібліятэк расказалі аб створаных рэсурсах і дзеючых праектах па захаванні гістарычнай памяці і патрыятычнаму выхаванню. Вынікам прафесійнай сустрэчы бібліятэкараў Беларусі і Расіі стаў план сумесных мерапрыемстваў, які прадугледжвае правядзенне ў 2024-2025 гадах навукова-практычных канферэнцый і сустрэч, анлайн-праектаў і марафонаў, абмен выставамі, падрыхтоўку тэматычных інфармацыйных выданняў, прымеркаваных да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне[187].

- майстры з Магілёўскай вобласці прынялі ўдзел у III Міжнародным фестывалі драўлянай скульптуры «Алтай. Прыцягненне» ў Алтайскім краі (РФ)[188] і ва Усерасійскім фестывалі-конкурсе народных рамёстваў «Хлуднеўскае дрэва» ў Калузе (РФ). Апошні фестываль сабраў больш за 40 умельцаў з 12 рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Галоўнай задачай фестываляў з'яўляецца пашырэнне супрацоўніцтва ў сферы народнага мастацтва, матэрыяльнай і духоўнай культуры рэгіёнаў[189].

- у рамках 450-гадовага юбілею горада Уфа (Рэспубліка Башкартастан, РФ) адбылося ўрачыстае адкрыццё VIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Сэрца Еўразіі» з удзелам зорак беларускай і расійскай эстрады. У мерапрыемстве прынялі ўдзел артысты Маладзёжнага тэатра эстрады (Беларусь)[190].

[184] https://t.me/minkultrb/41214
[185] https://t.me/minkultrb/41233
[186] https://t.me/minkultrb/41243
[187] https://t.me/minkultrb/41315
[188] https://t.me/minkultrb/41246
[189] https://t.me/minkultrb/41396
[190] https://t.me/minkultrb/41290

- Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь прыняў удзел у XIV Міжнароднай асамблеі мастакоў «Пластоўская восень», якая прайшла ў горадзе Ульянаўск і вёсцы Прыслоніха Карсунскага раёна Ульянаўскай вобласці (РФ). У рамках асамблеі адбылася Міжнародная канферэнцыя «Праблема стылю ў айчынным мастацтве: тэндэнцыі, уплыву, своеасаблівасць»[191].

***Узбекістан:***

- Беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай накіравалася ў Рэспубліку Узбекістан з афіцыйным візітам, падчас якога адбыўся Другі Узбекска-беларускі жаночы бізнес-форум. У склад дэлегацыі ад сферы культуры ўвайшлі: дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Кацярына Дулава, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр Храмой і прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Корсакава. У час афіцыйных мерапрыемстваў быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным музеем гісторыі Узбекістана[192]. Мемарандум аб супрацоўніцтве таксама падпісалі Вялікі тэатр Беларусі і Дзяржаўны акадэмічны тэатр Узбекістана ім. А. Наваі *(«Мемарандум аб двухбаковым супрацоўніцтве без сумневу, яшчэ больш умацуе сяброўскія сувязі паміж нашымі творчымі калектывамі»).* Мемарандум прадугледжвае арганізацыю гастрольнай дзейнасці двух калектываў, абмен салістамі і калектывамі, ажыццяўленне сумесных пастановак, правядзенне майстар-класаў і іншыя формы творчага ўзаемадзеяння. Наталля Качанава ў якасці ганаровага госця прыняла ўдзел у фестывалі «Шарк тараналары» («Мелодыі Усходу»)[193,194].

- ва Узбекістане (г. Самарканд) у рамках XIII Міжнароднага музычнага фестывалю Sharq Taronalari прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Музычная культура Усходняй Азіі: прынцыпы творчай інтэграцыі ў працэсе глабалізацыі». У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 80 краін свету. Рэспубліку Беларусь прадстаўляў Аляксандр Бабук, намеснік генеральнага дырэктара, дырэктар па навуцы і інфармацыйных тэхналогіях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі[195].

***Кітай:***

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае падпісанне пагаднення аб сумеснай вытворчасці беларуска кітайскага фільма «На вякі вечныя». Над карцінай будуць працаваць Нацыянальная кінастудыя

---

[191] https://t.me/minkultrb/41453
[192] https://t.me/minkultrb/41172
[193] https://t.me/minkultrb/41181
[194] https://t.me/minkultrb/41203
[195] https://t.me/minkultrb/41206

«Беларусьфільм» і кампанія «Сычуань Блю Айз Фільм энд Тэлевіжн Калчар Медыя». Пачатак здымак запланаваны на кастрычнік. Больш за чвэрць экраннага часу зойме беларускі блок[196,197]. Юрый Аляксей, генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм»: *«“Беларусьфільм” упершыню супрацоўнічае з Кітаем, сумесных стужак раней не было. Гэта будзе сапраўды маштабны кінапраект»*[198].

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыўся Кітайскі цэнтр кнігі. Як сцвярджаюць арганізатары, гэты цэнтр дасць чытачам магчымасць пазнаёміцца з літаратурай аб гісторыі, дзяржаўным ладзе, культуры і мастацтве, традыцыях і звычаях Кітая, а таксама з творамі кітайскіх аўтараў. Кнігі прадстаўлены на кітайскай, рускай і англійскай мовах[199,200].

***Сербія:***

- у рамках рабочага візіту Нацыянальную бібліятэку Беларусі наведаў Міністр інфармацыі і тэлекамунікацыі Рэспублікі Сербія Дзеян Рысціч, а таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна Вукайловіч. Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін для гасцей правёў экскурсію па будынку бібліятэкі[201].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 21 па 31 жніўня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- Міжнародны фестываль сучаснай этнічнай культуры «RUS_СВЕТ»** *(Краснагорск, РФ).* Прадстаўнік Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў ім. Сакалоўскага Уладзіслаў Мікольскі прыняў удзел у праграме фестывалю ў рамках праграмы Рассупрацоўніцтва «Новае Пакаленне»[202].

**- Творчы праект «Мы і кіно. Пашыраючы межы».** Беларуская моладзь прыняла ўдзел у праекце ў рамках праграмы «Новае Пакаленне» і

[196] https://t.me/minkultrb/41003
[197] https://t.me/minkultrb/41037
[198] https://t.me/minkultrb/41039
[199] https://t.me/minkultrb/41174
[200] https://t.me/minkultrb/41217
[201] https://t.me/minkultrb/41249
[202] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14572

Міжнароднага маладзёжнага кінафестывалю «МЫ» пры падтрымцы Рассупрацоўніцтва. Удзельнікі стваралі ідэі для іграваых і дакументальных фільмаў у супрацоўніцтве з вядомымі расійскімі майстрамі кінамастацтва[203].

**- Урачыстая цырымонія ўзнагароджання ветэранаў з нагоды святкавання 50-годдзя пачатку будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі** *(Дом Масквы ў Мінску).* Пры падтрымцы прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь увазе гасцей была прадстаўлена фотавыстава «БАМ — сузор'е герояў»[204].

**- «За русский!» — праект па прасоўванні рускай мовы і літаратуры за мяжой.** Арганізатары: Рассупрацоўніцтва сумесна з Універсітэтам імя Лабачэўскага (РФ). Праект будзе рэалізаваны ў некалькі этапаў. На першым плануецца правядзенне конкурсу ў дыстанцыйным фармаце. А 30 студэнтаў з ліку пераможцаў і фіналістаў будуць накіраваны за кошт праекта ў Рускія Дамы за мяжу, дзе ўжо на практыцы прымуць удзел у рэалізацыі праектаў і падрыхтоўцы мерапрыемстваў па распаўсюджванні рускай мовы па ўсім свеце[205].

**- Усерасійская акцыя «Ноч Кіно», прымеркаваная да Дня расійскага кінематографа.** Госці Рускага Дома ў Мінску, Дома Масквы ў Мінску, кінатэатра «Радзіма» ў Быхаве і кінатэатра «Зорка» ў Бялынічах паглядзелі экранізацыю рускай народнай казкі «По щучьему велению» і фантастычны расійскі фільм «Сто лет тому вперёд». У Бялынічах перад пачаткам кінапаказаў намеснік кіраўніка прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Ленін перадаў у дар установам горада серыю кніг, прысвечаных гісторыі савецкага і расійскага кінематографа[206,207]. А ў Рускім Доме ў Гомелі перад пачаткам паказу госці пагрузіліся ў тэматычную кніжную выставу паводле твораў Кіра Булычава. Таксама для прысутных была праведзена інтэлектуальна-пазнавальная віктарына аб творчасці аўтара[208]. У рамках акцыі ў Маладзёжным цэнтры Гродна паказалі дзве навінкі расійскага кінематографа: фантастычны блокбастар «Сто лет тому вперёд» і ваенна-гістарычную драму «Воздух» Аляксея Германа-малодшага[209].

**- Конкурс для студэнтаў і маладых вучоных Расіі і Беларусі, арганізаваны Фондам спадчыны рускага замежжа.** Як паведамляюць арганізатары, пераможцы атрымаюць гранты на правядзенне даследаванняў і стварэнне асветніцкіх праектаў на тэму «Культурна-гістарычная спадчына рускай эміграцыі 1-й паловы XX стагоддзя»[210].

---

[203] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14580
[204] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14588
[205] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14596
[206] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14597
[207] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14603
[208] https://t.me/russiangomel/4678
[209] https://t.me/russkiydomvgrodno/1686
[210] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14611

- **Праект «Нашы бібліятэкі: чытаць па-руску»** *(Санкт-Пецярбург).* Штогадовая праграма прафесійнага развіцця ажыццяўляецца Цэнтральнай гарадской публічнай бібліятэкай імя Маякоўскага па ініцыятыве Камітэта па знешніх сувязях Санкт-Пецярбурга пры арганізацыйнай падтрымцы Рассупрацоўніцтва. Сёлета ў праекце прымуць удзел 15 бібліятэкараў з Беларусі[211].

- **Гісторыка-публіцыстычная вечарына «Вялікая вайна, якая ўзрушыла ўвесь свет»** *(Рускі Дом у Мінску).* Да 110-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны старшыня беларускага грамадскага аб'яднання «Русь» Мікалай Сяргееў прапанаваў прысутным паразважаць аб прычынах узнікнення найбуйнейшага геапалітычнага канфлікту і імкненні Расіі прадухіліць вайну. У працяг гутаркі госці паглядзелі дакументальны фільм «Выкрадзеная перамога. Расія ў Першай сусветнай вайне»[212].

- **Круглы стол «Вялікія даты Гродзеншчыны» з удзелам ветэранаў і кадэтаў-навучэнцаў школ №38 і №39 горада Гродна** *(Рускі Дом у Гродне).* Сустрэча была прысвечана сувязі пакаленняў і захаванню гістарычнай памяці. На круглым стале з кароткай гісторыяй Гродзеншчыны выступілі старшыня Гродзенскай гарадской арганізацыі ветэранаў Аляксандр Радзівонаў, падпалкоўнік, член Савета ветэранаў Кастрычніцкага раёна горада Гродна Аляксандр Балябрух і настаўнік гісторыі сярэдняй школы №40 горада Гродна Дзяніс Тарасевіч. Успомнілі знакавыя бітвы, войны і альтэрнатыўныя даты заснавання горада. На мерапрыемстве таксама прысутнічалі: Алена Літвішэнка (кіраўнік Рускага Дома ў Гродне), Юрый Саломін (віцэ-консул Генеральнага консульства Расійскай Федэрацыі ў Гродне), Аляксандр Бірукоў (старшыня Гродзенскага аддзялення «Рускага таварыства»)[213].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 21-31 жніўня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

[211] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14651
[212] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14656
[213] https://t.me/russkiydomvgrodno/1679

**У школах уводзяць штомесячныя інфармгадзіны аб генацыдзе беларускага народа.**

У школах штомесяц з 1-га па 11-ты клас будуць праходзіць інфармацыйныя гадзіны па вывучэнні пытанняў генацыду беларускага народа. Пра гэта расказала галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Наталля Дудкіна. *«Яны будуць прысвечаны значным падзеям у гісторыі нашай краіны: Дню народнага адзінства, 81-й гадавіне трагедыі ў Олі, Дню Канстытуцыі, 82-й гадавіне трагедыі ў Хатыні, Дню яднання народаў Беларусі і Расіі»,* — паведаміла яна[214].

***

**Адзін з мінскіх будынкаў даваеннай пабудовы могуцьператварыць у музей генацыду беларускага народа.**

У Мінску камісія на чале са старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцёмам Цуранам аглядала будынкі Фрунзенскага раёна, якія не выкарыстоўваюцца. Адзін з даваенных будынкаў на вул. Лынькова, 111, пабудаваны ў 1937 годзе, могуць ператварыць у музей генацыду беларускага народа. Мяркуючы па ўсім, маецца на ўвазе адрас Міхася Лынькова, 111Г. Гэта трохпавярховы цагляны будынак былых казармаў Беларускай ваеннай акругі, пабудаваны ў стылі ар-дэка ў 1937-1938 гадах[215].

***

**У вучэбнай праграме «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» для БНР не знайшлося месца.**

БНР больш няма ў спісе формаў беларускай дзяржаўнасці па версіі Мінадукацыі. Але ў вучэбнай праграме па Гісторыі Беларусі Беларуская Народная Рэспубліка застаецца, прынамсі пакуль што[216].

***

**Напярэдадні навучальнага года наданне Ліцэю БДУ імя Фелікса Дзяржынскага афіцыйна замацавалі літарамі на фасадзе будынка[217].**

Нагадаем, пра тое, што Ліцэю БДУ могуць прысвоіць імя Жалезнага Фелікса, стала вядома яшчэ ў сакавіку з рабочай сустрэчы дырэктаркі Ліцэя Таццяны Мамчыц з кіраўніцтвам БДУ. Тады яна перадала рэктару

[214] https://reformby.org/v-shkolah-vvodjat-ezhemesjachnye-informchasy-o-genocide-belarusskogo-naroda
[215] https://news.zerkalo.io/life/76894.html?c
[216] https://t.me/euroradio/56536
[217] https://t.me/euroradio/56335

БДУ Андрэю Каралю *«калектыўны зварот супрацоўнікаў Ліцэя з прапановай аб прысваенні навучальнай установе імя выдатнага ўраджэнца беларускай зямлі Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага»*. А ўжо 17 чэрвеня Ліцэй БДУ атрымаў імя Дзяржынскага афіцыйна[218].

***

**У Івацэвічах гасцям Дня беларускага пісьменства паказалі ваенна-гістарычную рэканструкцыю вызвалення Івацэвіцкага раёна[219].**

Таксама на пляцоўцы каля гарадскога Дома культуры была ўрачыста адкрытая кампазіцыя «Дзеці лясной школы», якая нагадвае пра часы Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна[220], і была прадстаўлена мабільная экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Наш абавязак — памятаць!», якая складалася з раздзелаў, што расказвалі пра абарончыя баі на савецка-германскім фронце ў 1941-1942 гг., гісторыю падпольнай і партызанскай барацьбы на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гадах і аб вызваленні Беларусі[221].

***

**У Брэсцкай крэпасці замазалі савецкі надпіс «здесь работал Павлов», а прарасійскія актывісты абурыліся.**

Навіной падзяліўся брэсцкі прарасійскі актывіст Пётр Піцко ў сваім тыктоку. Ён распавёў, што надпісаў байцоў гарнізона, пакінутых на сценах Заходняга форта крэпасці, больш няма. Актывіст паказаў зафарбаванае месца, дзе знаходзіўся надпіс «здесь работал Павлов г. Псков», які быў нанесены тонкім алоўкам. Прыхільнікі «рускага свету» патрабуюць рэпрэсаваць вінаватых, хоць каштоўнасць надпісаў выклікае пытанні[222].

***

**Былы палітвязень, які выйшаў на волю з віцебскай калоніі № 3, распавёў, што адміністрацыя калоніі варожа ставіцца да беларускай мовы.**

Па словах мужчыны, адзін з супрацоўнікаў парваў карцінкі і тэксты, напісаныя па-беларуску. *«Кажа мне: “Да ты што, звар’яцеў тут па-беларуску размаўляць?”»*[223].

[218] https://nashaniva.com/345079/
[219] https://t.me/kultinfa/8343
[220] https://t.me/kultinfa/8345
[221] https://t.me/kultinfa/8375
[222] https://nashaniva.com/350126
[223] https://spring96.org/be/news/116138

***

**У Валожыне да Дажынак пачалі ўсталёўваць указальнікі для турыстаў. Адметна тое, што ўсе яны на рускай мове. Месца для беларускай мовы не знайшлося[224].**

***

**Журналістка дзяржаўнай газеты «СБ. Беларусь сегодня» вырашыла правесці эксперымент, наколькі лёгка сарыентавацца ў Мінску англамоўнаму замежніку, і з жалем адзначыла, што інфармацыя на табло на чыгуначным вакзале ў Мінску падаецца толькі на рускай мове.**

Нагадаем, на вакзале з пачатку года прыбралі англійскую мову на інфармацыйных табло. Частку надпісаў проста заклеілі ізалентай. Выкрэсліванння англійскай мовы і беларускай лацінкі з гарадской прасторы дабіваліся прарасійскія актывісты з Вольгай Бондаравай на чале. Рашэнне прыбраць лацінку ў выніку спусцілі з Адміністрацыі Лукашэнкі. Прапаганда абараняла гэту пазіцыю[225].

***

**Знакаміты верш Янкі Купалы «Хто ты гэткі» прызналі экстрэмісцкім.**

У пачатку года незаўважаным прайшло рашэнне суда Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ад 26 студзеня 2024 года: прызнаць экстрэмісцкай прадукцыяй відэакліп і тэкст песні «Не быць скотам» гурта «Ляпіс Трубяцкі». Тэкст песні цалкам скампіляваны з радкоў верша Янкі Купалы «Хто ты гэткі?», напісанага будучым класікам у час нацыянальнага абуджэння. Такім чынам разам з песняй «Ляпісаў» быў забаронены і купалаўскі твор. Адрозненне паміж тэкстамі толькі адно: замест «Дзе радзіўся?» у песні гучыць «Дзе нарадзіўся?» — гэтага адрознення наўрад ці будзе дастаткова, каб не патрапіць пад адказнасць за выкарыстанне верша Янкі Купалы[226].

***

**Суд у Мінску прызнаў «экстрэмісцкімі» кнігі гісторыка Ігара Мельнікава, які больш за паўгода знаходзіцца ў зняволенні.**

«Экстрэмісцкімі» прызналі кнігі, «а таксама іх копіі альбо іншыя кніжныя выданні»: Нічыпарук П.К., Мельнікаў І.В. Адысея палешука / Павел Нічыпарук, Ігар Мельнікаў. — Мінск: «Альфа-кніга», 2017. — 328 с.; Мельнікаў, І.В. Забыты корпус: гісторыя польскага войска на тэрыторыі Бабруйшчыны

---
[224] https://t.me/spadczyna/11047
[225] https://nashaniva.com/349976
[226] https://nashaniva.com/350337

ў 1918, 1919–1920 гадах / Ігар Мельнікаў — Минск: «Альфа — кніга», 2018. — 224 с. Мельнікаў, І.В. На «мяжы цывілізацый». Старонкі гісторыі даваеннага савецка-польскага кардона ў Беларусі / Ігар Мельнікаў. — Мінск: «Альфа — кніга», 2020. — 352 с[227].

***

**У Беларусі прызналі экстрэмісцкімі Instagram-старонку мастака Уладзіміра Цэслера (суд Пухавіцкага раёна)[228] і суполкі аматараў беларускамоўнай Вікіпедыі ва «Укантакце» і ў Telegram (суд Ленінскага раёна Магілёва)[229].**

*******

**Стала вядома, пра што будзе сумесны беларуска-кітайскі фільм «На вякі вечныя».**

Кінастудыя «Беларусьфільм» і кампанія па вытворчасці кіно і тэлебачання правінцыі Сычуань (Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media) падпісалі дамову аб стварэнні мастацкага фільма «На вякі вечныя». Генеральным прадзюсарам і галоўным рэжысёрам фільма будзе генеральны дырэктар кітайскай кампаніі Лэй Хань. Фільм коратка апісваецца так: *«Двое маладых людзей, якія выхоўваліся ў разных краінах і культурах, адпраўляюцца ў складанае падарожжа»*. У фільме будзе дзве часткі — гістарычная і сучасная. У першай будуць паказаны часы Другой сусветнай вайны, калі савецкія (у тым ліку і беларускія) добраахвотнікі дапамагалі кітайцам змагацца з японскай агрэсіяй. Сцэнарый напісаны кітайскім бокам. Па словах Лэй Ханя, які прымаў актыўны ўдзел у яго стварэнні, *«галоўная задача — паказаць, што супрацоўніцтва і ўзаемасувязь паміж жыхарамі Беларусі і Кітая мае глыбокія карані»*[230].

***

**У Мінску прэзентавалі стужку «Культурны код» аб дзяржаўных сімвалах.**

*«Гэты фільм вельмі важны, ён зойдзе ў кожную навучальную ўстанову, на кожнае прадпрыемства, мы будзем яго паказваць і прапагандаваць нашы культурныя каштоўнасці, каштоўнасці нашай краіны»*, — паведаміў генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей. Адметна, што самым цікавым у новай працы Кірылы Халецкага з'яўляецца сумяшчэнне ігравога і дакументальнага кіно. У фільме простых гараджан

---

[227] https://news.zerkalo.io/life/77100.html?c
[228] https://t.me/viasna96/27430
[229] https://t.me/viasna96/27291
[230] https://nashaniva.com/349868

на вуліцы просяць адказаць на пытанне, што азначаюць колеры дзяржаўнага сцяга, ці любяць яны сваю краіну. Аднак гэты ход — апытанне мінчан на вуліцах — ужо быў выкарыстаны ў іншай стужцы кінастудыі «Беларусьфільм», якая легла на паліцу ў 2022 годзе — «Гэта я, Мінск» Дзмітрыя Дзядка і Андрэя Грынько[231].

***

**У Гомелі адкрыўся кінатэатр пад адкрытым небам, дзе на першым сеансе паказалі савецкі фільм «Кавказская пленница».**

У тэлеграм-канале старшыні Гомельскага гарвыканкама Уладзіміра Прывалава было арганізавана галасаванне. Жыхарам горада прапаноўвалася выбраць з трох фільмаў: «Кавказская пленница, или Новые приключения Шурика», «Девушка без адреса» і «Бриллиантовая рука»[232].

***

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіць штомесячны цыкл кінапаказаў «Магія кінакадра», які стартаваў у маі і прымеркаваны да 100-годдзя беларускага кіно і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

22 жніўня «па просьбах гледачоў» дэманстравалася другая частка кінатрылогіі «Долгие версты войны» — фільм «Атака с ходу»[233].

***

**Да 180-годдзя з дня нараджэння рускага кампазітара М. Рымскага-Корсакава ў Вялікім тэатры Беларусі прайшоў паказ оперы «Царская нявеста»[234].**

***

**Стала вядома, што ў верасні на сцэне Вялікага тэатра Беларусі адбудзецца прэм’ера спектакля «Патэтычны дзённік памяці», які прадставіць сучаснаму гледачу погляд на гісторыю краіны ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны[235], а ў іншы дзень загучаць «меладычныя і кранальныя, шчырыя і лірычныя» рускія рамансы.**

---

[231] https://reformby.org/po-zakazu-ministerstva-kultury-v-minske-prezentovali-lentu-kulturnyj-kod-o-gosudarstvennyh-simvolah
[232] https://reformby.org/gomelchane-uvidjat-kavkazskuju-plennicu-pod-otkrytym-nebom
[233] https://t.me/libraryofbel/3972
[234] https://t.me/bolshoibelarus/25987
[235] https://web.telegram.org/a/#-1001342250010

На тэатралізаваным канцэрце «Вечар старажытнага раманса» можна будзе пачуць творы: «Всё – Вы!», «Ночь светла», «О, если б мог выразить в звуке», «Нет, не люблю я вас…», «Сомнение», «Бубенцы», «Что мне жить и тужить одинокой?», «Очи черные», «Эй, ямщик, гони-ка к «Яру»!», «Я вас любил», «Не пой, красавица, при мне….», «Дорогой длинною», «Очаровательные глазки», «Пленившись розой, соловей…», «Гори, гори, моя звезда», «Только раз» і іншыя[236].

***

**Расійскі рэжысёр паставіць у Купалаўскім тэатры спектакль «Дзядзечкін сон» па творы рускага пісьменніка Дастаеўскага.**

Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Вольга Няфёдава распавяла, што ў найбліжэйшы час плануецца супрацоўніцтва з рэжысёрам Дзмітрыем Акімавым, прадстаўніком Расійскай Федэрацыі, які ўжо рабіў спектакль «А зоры тут ціхія». На гэты раз Дзмітрый Акімаў будзе працаваць над спектаклем па Дастаеўскаму «Дзядзечкін сон»[237].

***

**Стала вядома, што акцёр-купалавец Дзмітрый Есяневіч сутыкнуўся з рэпрэсіямі ў Беларусі.**

Дзмітрый Есяневіч быў затрыманы яшчэ ў маі, калі выязджаў з Беларусі на гастролі. Ён трапіў на суткі, але інфармацыя пра яго перaслед не апублічвалася. Акцёр змог выехаць з Беларусі[238].

***

**Чарговы сталічны тэатр застаўся без кіраўніка. Андрэй Гузій пакінуў пасаду галоўнага рэжысёра Маладзёжнага тэатра.**

Аб зыходзе Гузія стала вядома летам гэтага года, аднак якія-небудзь падрабязнасці, а таксама пацвярджэння інфармацыі не было. Калі менавіта адбылося звальненне, таксама не паведамлялася. У Маладзёжным тэатры Гузій працаваў з 2019 года, галоўным рэжысёрам — з 2020-га. У апошні час звальненні ў беларускіх тэатрах сталі рэгулярнымі[239].

---

[236] https://web.telegram.org/a/#-1001342250010
[237] https://reformby.org/spektakl-rasijskaga-rjezhysjora-i-netryvijalnyja-padyhody-da-pastanovak-u-akadjemichnym-tjeatry-imja-janki-kupaly-pacha-sja-105-y-tjeatralny-sezon
[238] https://nashaniva.com/349727
[239] https://news.zerkalo.io/cellar/76321.html?tg=4

***

**У Мінску на Дзень горада правядуць Дні Екацярынбурга.**

Штогод у другую суботу верасня ў Мінску адзначаецца Дзень горада. У гэтым годзе 14 верасня сталіцы споўніцца 957 гадоў. Ужо зацверджаны план свята з больш як 100 мерапрыемстваў. Напярэдадні Дня горада, 10 верасня, у Мінскай гарадской ратушы ўзнагародзяць *«мінчан, якія прымаюць актыўны ўдзел у ахове грамадскага правапарадку і прафілактыцы правапарушэнняў»*. А 13 верасня ў Мінску будуць арганізаваны Дні горада Екацярынбурга[240].

***

**Адбылося падпісанне пагаднення аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Краснадарскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем-запаведнікам ім. Феліцына.**

Кіраўнікамі музеяў былі абмеркаваны перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва, дасягнуты дамоўленасці аб рэалізацыі сумесных выставачных праектаў, мерапрыемстваў на 2025 год і на далейшую будучыню[241].

***

**Выставы:**

У Гістарычным музеі Крычава адкрылася новая выстава «Жаночая палова» расійска-беларускага мастацкага праекта «Абярэжны круг»[242]. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё фотавыставы «Ззяе Ташкент»[243].

[240] https://news.zerkalo.io/cellar/76789.html?tg=7
[241] https://t.me/bellitmuseum/1760
[242] https://t.me/kultinfa/8165
[243] https://t.me/kultinfa/8227